# Дар'я Афанасьева: «У турме жанчынам забаронена любіць»

***Партрэт.*** *Дар’я Афанасьева – фем-актывістка з Беларусі, блогерка, лесбіянка, былая палітвязынка. У дадзеным кантэксце яна не лічыць дарэчнай фармулёўку «былая» — бо гэты досвед застаецца з чалавекам назаўжды.*

Сябры клічуць яе Дафнай. Мне таксама гэта дазволена. Перш чым пагаварыць з ёй, я праглядаю ейны блог у Instagram і выпадкова трапляю на фатаграфію нас абедзвюх. У 2020 годзе ў Мінску я намалявала плакат і хадзіла з ім на акцыі пратэсту. Дафна, якой тады спадабаўся слоган феміністычнага ладу на ім, сфатаграфавала плакат. Пазней яе абвінавацілі ў палітычнай і феміністкай актыўнасці, прычым гэты фотаздымак быў выкарыстаны ў якасці аднаго з так званых «эпізодаў». Абвінавачванне складалася з пэўнай колькасці зафіксаваных «эпізодаў» - удзела ў дэманстрацыях, зробленых здымкаў, каментароў у сацыяльных сетках. Размаўляючы з ёй, я думаю аб тым, што па волі лёсу яна, а не я, правяла ў турме два з паловай гады, і радуюся, што Дар’я ўжо восем месяцаў на волі і ў бяспецы.

## «У зняволенні жанчын пазбаўляюць самапавагі»

Раней Дар’я працавала ў IT-індустрыі менеджарам па персаналу, але ў нейкі момант вырашыла зрабіць паўзу. Сёння яна не прадстаўляе ніякай арганізацыі або кампаніі, акрамя самой сябе. Асветніцкая праца і павышэнне дасведчанасці працягваецца – зараз Дафна дае інтэрв'ю не толькі як феміністка, але і як жанчына з досведам зняволення. Кажа, што рыхтавалася да гэтай працы і менавіта з гэтай прычыны з’ехала з Беларусі. Яна ніколі не адмаўляецца ад інтэрв’ю і карыстаецца любой магчымасцю, каб распавесці свету пра ўмовы ў турмах і папраўчых калоніях у Беларусі: *«Жанчыны пазбаўленыя не толькі свабоды, але і здароўя, і годнасці. […] Ім забаронена мець стасункі, падтрымліваць адна адну, дзяліцца, любіць».*

Асабліва яе хвалюе тэма хатняга гвалту, з-за якой многія жанчыны трапляюць у турму як нібыта агрэсаркі. Дар’я кажа, што замест магчымых крымінальных артыкулаў з меншым тэрмінам (кшталту «перавышэнне неабходнай абароны», «нанясенне цяжкіх цялесных пашкоджанняў, якія прывялі да смерці») усіх асуджаюць па артыкуле «наўмыснае забойства»: *«Дык нават калі яны дзейнічалі ў мэтах самаабароны, гэта нідзе не ўлічваецца! Нават калі яны самі цярпелі пабоі.»*

## Ні сяброўства, ні кахання

Дар’я не забывае сваіх сябровак і сяброў у турме – як асуджаных за палітычную дзейнасць, так і тых, хто атрымаў ярлык забойцаў. Яна падтрымлівае з імі сувязь праз сваякоў і спадзяецца, што аднойчы яны ўсе зноў сустрэнуцца, калі апынуцца на волі.

Дар’я распавядае, што заўсёды адкрыта выступала за правы ЛГБТК+-супольнасці, але доўгі час не афішавала ўласнае лесбіянства – у гэтым не было патрэбы. У турме яна сутыкнулася з моцнай гамафобіяй і зразумела, што хоча жыць адкрыта і не хаваць свае рамантычныя адносіны з жанчынамі: *«Мяне асудзілі на два з паловай гады, а іншыя жанчыны сядзяць там па 10-15 гадоў. Не адчуваць ніякага цяпла, ніякай падтрымкі, сяброўства і кахання – гэта вельмі цяжка, асабліва калі ты квір-асоба».* Дар’я кажа, што жанчынам у камерах забаронена займацца каханнем, і калі пра гэта даведаецца кіраўніцтва турмы, жанчын чакае жорсткае пакаранне.

## «Рана ці позна мой блог будзе прызнаны экстрэмісцкім»

У нейкі момант Дар’я стварыла блог – спачатку як кніжны блог. Яна пісала рэцэнзіі на кнігі, якія знаходзіла сама або якія ёй дасылалі выдаўцы. Затым яна пачала ўсё больш і больш цікавіцца фемінізмам увогуле – не толькі ў сувязі з кнігамі. Сярод яе падпісчыкаў быў жарт: «Дафна ўсё яшчэ спрабуе пераканаць нас, што гэта кніжны блог, але гэта ўжо даўно не так». Таму Дафна перайшла ў лайфстайл-фармат і пачала больш распавядаць пра свой досвед – чым займаецца ў вольны час, дзе жыве, якія імпрэзы наведвае. Кожную пятніцу яна публікавала калонку пытанняў і адказаў, і гэтыя пытанні часта былі асабістымі, а не прафесійнымі. Яна і сёння не баіцца быць адкрытай. У гэтым яе ўразлівасць і яе сіла.

Старонка Дар'і некаторы час была выдаленая, каб не даваць пракуратуры яшчэ больш матэрыялаў для падмацавання крымінальнай справы супраць яе. Пазней старонка была адноўлена. У гэты момант Дар'я заплакала: *«Гэта было, як быццам да мяне вярнулася маё дзіця, якое я гадавала шмат гадоў. Я ўклала ў гэты блог шмат сіл і імпэту!»*

Раней аўдыторыя Дар'і складала каля 10 тысяч чалавек. Зараз іх на тысячу менш, што Дар'я звязвае са сваёй актывісткай дзейнасцю. У Беларусі дзейнічае закон аб экстрэмізме, адпаведна якому любы кантэнт з крытыкай уладаў лічыцца экстрэмісцкім. Гэта азначае, што ўзаемадзеянне з гэтым кантэнтам (падабайкі, каментары, расшэрванне), а таксама падпіска на яго з'яўляюцца крымінальным злачынствам. Дар’я разлічвала страціць палову аўдыторыі, бо палітычная сітуацыя ў краіне падчас яе зняволення працягвала пагаршацца. Акрамя таго, яна больш не такая актыўная ў Instagram, як раней: *«Раней я магла рабіць100 пастоў у дзень і адказваць на 150 асабістых паведамленняў. Зараз у мяне больш няма на гэта рэсурсаў. Патрэбен час, каб аднавіцца пасля зняволення як эмацыйна, так і фізічна»*.

## Гумар як стратэгія выжывання

*«У судзе мне яшчэ казалі, што я сваімі вясёлкавымі шкарпэткамі сапсую нацыю»*, – распавядае Дар’я. Людзям, мала знаёмым з рэчаіснасцю ў Беларусі, гэтыя абвінавачанні падаюцца абсурднымі і з іх хочацца пасмяяцца. Нягледзячы на цяжкі турэмны вопыт, які прывёў да посттраўматычнага стрэсавага разладу і дэпрэсіі, Дар'я бесперапынна жартуе. Гумар - гэта не толькі неад'емная частка яе асобы, але і базавая здольнасць спраўляцца з цяжкасцямі, пад цяжарам якіх іншыя даўно б здаліся.

Дар'я распавядае мне, што падпісчыцы і падпісчыкі на яе блог часта дасылаюць ёй асабістыя паведамленні з гісторыямі са свайго жыцця – напрыклад, пра сэксуальны гвалт або сыход ад жорсткіх партнёраў. Дар'я эмпатычная і ўспрымае гэтыя гісторыі блізка да сэрца. У той жа час яна іранічна каментуе: *«Так, блогерка Даша з Беларусі абавязкова дапаможа табе ў жыцці»*. Але гэта дапамагае мець кантакты з жаночымі прытулкамі і юрыдычнымі службамі альбо распазнаваць гвалтоўную дынаміку ў адносінах.

За час знаходжання ў турме Дафна і яе сукамерніцы склалі спісы ўсяго, што яны хацелі б зрабіць у сваім жыцці пасля вызвалення. Сярод іншага ў спісе Дар'і значылася: выступленне ў феміністкім стэндап-шоў. Праўда, тут жа дадае, што трэба каб у зале было больш “турэмных дзяўчат”, бо яе жарты асаблівыя і не зусім зразумелыя звычайнай стэндаперскай аўдыторыі. Напрыклад, яна распавядае мне жарт пра салодкія ласункі, якія яна таемна пранесла на турэмную фабрыку ў бялізне і шкарпэтках, каб ахоўнікі іх не заўважылі. Я не зразумела жарту – нават пасля велікадушнай спробы Дар'і растлумачыць

мне яго. Турэмны гумар ён такі. Ён таксама бывае жорсткім і некарэктным, але ў турме па-іншаму не пажартуеш.

**Пра новае жыццё ў Польшчы**

Пытаюся ў Дар'і, ці можна мне публічна паведаміць, што яна зараз у Польшчы: «Я зрабіла сэлфі для свайго інспектара міліцыі на фоне хмарачосаў і сказала, каб ён не чакаў мяне ў Чыжоўцы». Гэта быў яе іранічны адказ.

Зараз Дар'я не мае магчымасці выязджаць з Польшчы, бо чакае ад польскіх уладаў статусу міжнароднай абароны і праязнога дакумента. Працэс доўжыцца ўжо паўгады, і Дар'я спадзяецца, што з новымі паперамі яна хутка адчуе сябе больш упэўнена і зможа зноў падарожнічаць і дзяліцца сваімі прыгодамі з аўдыторыяй свайго блога. Яна таксама не выключае, што ў бліжэйшай будучыні на сваёй старонцы будзе асвятляць польскую палітыку, у прыватнасці, тэму абортаў.

У Дар'і ёсць сталая партнёрка – Ксенія. Яны пазнаёміліся ў Польшчы і жывуць разам: *«То бок я паехала ў Еўропу і думала сустрэць еўрапейскую жанчыну, а мне трапілася беларуска, якая таксама сядзела ў турме»,* – смяецца яна. Пасля зняволення ў Дар'і цяжкасці з памяццю і канцэнтрацыяй. Яе валодання польскай мовай недастаткова для паўнавартаснай камунікацыі. Ксенія падтрымлівае Дар'ю – вядзе для яе планаванне, арганізоўвае прыёмы ў дактароў, перакладае, калі трэба. Гэта дае мне зразумець, наколькі важна глядзець на турэмны досвед з абодвух бакоў. Не толькі з пункту гледжання самога чалавека, які знаходзіцца ў турме, але і тых, хто побач з ім (піша лісты, дасылае пасылкі ці проста чакае) і хто потым дапамагае справіцца з наступствамі – як зараз Ксенія.

Дар'я змянілася. Яна думала, што як толькі выйдзе на волю, адразу пойдзе ў ачмурэнныя клубы і будзе святкаваць жыццё. Але гэта не здарылася ні адразу, ні праз месяц і таксама ні да сёння, праз восем месяцаў. Ёй не хапае энергіі. Раней яна была вельмі экстравертнай, заўсёды знаёмілася з новымі людзьмі і любіла хадзіць у бары. Зараз яна аддае перавагу дому. Яе запрашаюць сяброўкі і сябры, але Дар'я ў асноўным ігнаруе запрашэнні. Ёй нялёгка прыняць тое, што зараз яна іншы чалавек. Яна чакае вяртання ў свой «стары» стан, але і гатовая да таго, што гэтага можа ніколі не здарыцца. Турма мяняе людзей.

Віка Біран